**С.І.Шарамецьеў,**
*аспірант кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*

# МАРАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ КУЛЬТУРЫ ЗНОСІН У СІСТЭМЕ НАВУЧАННЯ САЦЫЯЛЬНАГА РАБОТНІКА

Востры крызіс, які ахапіў усе сферы нашага грамадства, на жаль, так і не выяўляе тэндэнцый да затухання. Узмацненне супярэчнасцей у розных галінах эканомікі, палітыкі, духоўнай сферы, рэзкая палярызацыя інтарэсаў і жорсткая, часам трагічная форма іх выяўлення, змяненне каштоўнасных арыентацый і, як выбух насілля, рост злачыннасці, сацыяльнай напружанасці — усе гэтыя факты прымушаюць звяртацца да тых каштоўнасцей, якія аб'ядноўваюць людзей, становяцца арыенцірам у іх дзеяннях і ўчынках, дапамагаюць глыбей зразумець і ўсвядоміць нацыянальна-культурныя карані, традыцыі свайго народа.

У такія пераломныя этапы развіцця грамадства асаблівую актуальнасць набываюць пытанні, звязаныя з культурай, у прыватнасці з духоўнай, маральнай культурай узаемаадносін паміж людзьмі. Мы звернемся да аднаго з элементаў, што складаюць паняцце агульнай культуры чалавека, — да культуры зносін.

Актуальнасць гэтай праблемы ўзрастае і набывае новыя адценні, калі мы закранаем даволі складаную і супярэчлівую прафесію, якая толькі становіцца "на ногі", — прафесію сацыяльнага работніка. Бадай, ужо зараз можна гаварыць аб тым, што такая інтэграваная (лічыцца, што спецыяліст такой галіны адначасова выступае і як педагог, і як медык), востра неабходная для грамадства прафесія павінна заняць адно з вядучых месцаў у сацыяльнай сферы.

Сацыяльная работа вядзецца ў сістэме адукацыі, па арганізацыі вольнага часу, з сям'ёй і рознымі катэгорыямі насельніцтва па месцы жыхарства. Сацыяльны работнік



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізуе рэабілітацыйную і анімацыйную дзейнасць з дзецьмі і дарослымі, якія маюць фізічныя і псіхічныя адхіленні, з адзінокімі, сіротамі, інвалідамі і інш. Складанасць дадзенай прафесіі заключаецца ў яе неардынарнай, спецыфічнай форме ўзаемадзеяння з людзьмі.

Акрамя зносін з людзьмі, для якіх звычайнымі з'яўляюцца агульнапрынятыя нормы чалавечых паводзін, сацыяльнаму работніку даводзіцца актыўна ўзаемадзейнічаць з асобамі або групай людзей з неадэкватнымі паводзінамі. Для такіх паводзін характэрныя абвостранае ўспрыманне жыццёвых з'яў, павышаная эмацыянальная адчувальнасць, канфліктнасць. Таму асабліва важнай характарыстыкай спецыяліста выступае не толькі яго прафесійная кампетэнтнасць, але культура зносін, што з'яўляецца тым складаным аспектам сацыяльнай работы, які задае нарматывы паводзін і дзеянняў спецыяліста. Па гэтай прычыне ў аснову прафесійнай падрыхтоўкі сацыяльнага работніка павінна легчы асэнсаванне сваёй прафесійнай дзейнасці праз маральна-этычныя нормы зносін.

Пачатковым тэзісам у разглядзе пытанняў культуры зносін з'яўляецца разуменне зносін як спосабу існавання духоўнай культуры і маральнасці, як сутнаснай характарыстыкі чалавечай жыццядзейнасці. Паколькі ў культуры ўзнаўляецца і трансліруецца сукупны маральны вопыт людзей, зносіны з'яўляюцца формай, якая раскрывае і культуру грамадства, і культуру кожнай асобы. Такім чынам, культуру зносін можна ахарактарызаваць як сінтэтычнае паняцце, якое выражае ўвесь спектр чалавечых ацэнак зносін людзей на любым узроўні. У гэтым сэнсе паняцце "культура зносін" з'яўляецца якаснай характарыстыкай зносін. Сюды адносіцца азначэнне якасці зносін з пункту гледжання іх эфектыўнасці. Да культуры зносін можна аднесці і тое, што выражаецца ў паняцці "майстэрства зносін", г. зн. некаторыя тэхналагічныя характарыстыкі зносін, этыкетныя формы, навыкі і ўменні людзей мець зносіны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобна спынімся на маральным баку зносін. Тут вылучаюцца чатыры абавязковыя прынцыпы, якія асабліва важныя ў сацыяльнай рабоце.

Першы прынцып, які называецца альтруізмам, замацаваны ў старажытных філасофскіх канцэпцыях. Ён сцвярджае наступнае: "будзь шчодрым, "ідзі насустрач іншаму". Улік гэтага прынцыпу і забяспечвае роўнасць у зносінах, узаемаразуменне. Рэалізацыя дадзенага прынцыпу дазваляе не толькі спасцігнуць душэўны свет іншага, але і ўзбагаціць свой, асабісты.

Другі прынцып сфармуляваны яшчэ ў старажытнаіндыйскай філасофіі. Ён сцвярджае: "...стрымлівайце сябе, рабіце дары, будзьце міласэрнымі". Па сутнасці гэта цярпімасць, талерантнасць у адносінах да іншых, да іх меркаванняў, густу, звычак.

Цярпімасць не тоесная пакорнасці, гэта свядома выбраны спосаб стрыманых адносін да праяўлення іншадумства. Дадзены прынцып забяспечвае плюралізм меркаванняў, дае магчымасць глыбей далучыцца да каштоўнасцей іншага, г. зн. садзейнічае самавыхаванню.

Трэці прынцып вызначаецца інстынктыўным імкненнем да справядлівасц, роўнасці. Яшчэ Сакрат адзначаў, што зносіны тады маюць эфект, калі яны пры індывідуальнай і сацыяльнай няроўнасці забяспечваюць дыялог роўных суразмоўцаў. У гэтым прынцыпе акумулюецца мэта зносін: пры любым адрозненні меркаванняў людзі павінны быць здольнымі да дасягнення згоды, яднання і сумесных дзеянняў.

Чацвёрты прынцып ставіць эфектыўнасць зносін у залежнасць ад свабоды выбару як спосабаў зносін, так і іх удзельнікаў. Зносіны не павінны навязвацца, асоба суверэнная ў іх. Інакш кажучы, іх можна ахарактарызаваць як права чалавека на добраахвотны выбар сваіх паводзін пры зносінах.

Лічым, што названыя прынцыпы з'яўляюцца вельмі важнымі дзя наладжвання зносін сацыяльнага работніка з людзьмі любой сферы дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ